**Литература**

1. *Гаспаров Б. М.* Литературные лейтмотивы: Очерки русской литературы XX века. М., 1994.
2. *Десюкевич О. И.* Теория текста: пособие для студентов Института журналистики БГУ. Минск: БГУ, 2011.
3. *Лотман Ю. М.* Структура художественного текста // Об искусстве. СПб., 1998.
4. *Руднев В. П.* Словарь культуры XX века. М., 1997.

# ЭМАТЫКОНЫ Ў САЦЫЯЛЬНЫХ СЕТКАХ

**М. Л. Зайцаў**

Мова зносін карыстальнікаў інтэрнэту актыўна мяняецца. Сёння гэта галоўная крыніца ўзнікнення неалагізмаў і актывізацыі запазычанняў. У глабальнай сетцы найбольш яскрава адлюстроўваюцца новыя тэндэнцыі ў маўленчых працэсах сучаснасці.

Сацыяльныя сеткі з’явіліся ў сярэдзіне 1990-х гадоў. Першым падобным рэсурсам стаў сайт classmates.com. У 1996 годзе школьнікамі з Тэль-Авіва (Ізраіль) быў вынайдзены першы бясплатны сэрвіс кароткіх паведамленняў ICQ. Такія паведамленні патрабавалі сцісласці вербальнай інфарамацыі, якой яны дамагаліся дзякуючы графічным сімвалам – смайлікам і эматыконам. Хаця ёсць інфармацыя пра тое, што першым, хто паставіў пытанне аб увядзенні эматыконаў, быў Уладзімір Набокаў. Ён гаварыў пра неабходнасць увядзення спецыяльнага знака пунктуацыі, які графічна перадаваў бы эмацыянальны стан аўтара.

**Смайлік** (англ. smiley – «усмешлівы») або шчаслівы твар (☺ / ☻) з'яўляецца стылізаваным малюнкам тварыка з усмешкай.

**Эматыконы** (ад англ. emotion icon) з'яўляюцца своеасаблівымі знакамі, якія былі прыдуманы для абазначэння эмоцый чалавека, што ўдзельнічае ў віртуальных зносінах. Такім чынам смайлік як графема адносіцца да эматыконаў і з’яўляецца найбольш распаўсюджаным эматыўным дэйксісам.

Выкарыстанне смайлікаў і эматыконаў карыстальнікамі глабальнай сеткі значна спрашчае працэс камунікацыі, бо гэтыя сімвалы з даволі шырокай палітрай магчымых значэнняў арганічна ўпісваюцца ў любы кантэкст і ў залежнасці ад гэтага атрымліваюць сваё напаўненне.

Эматыконы як знакава-семантычныя інавацыі ў мове віртуальных зносін выконваюць функцыі:

1. псіхалагічную – непасрэдны выраз эмоцый таго, хто гаворыць;
2. прагматычную – імкненне да арыгінальнасці і экспрэсіўнасць абазначэння аб'ектаў і адносін;
3. стылістычную – гульня з мовай, аказіянальнасць зместавая і кампазіцыйная.

Да эматыконаў звычайна адносяць аднабаковыя дужкі, якія з’яўляюцца спрошчанай формай смайлаў і выконваюць больш эканомную функ-

цыю у маўленчых зносінах. Таксама функцыю эматыконаў выконваюць кропка, клічнік, пытальнік. Яны могуць ужывацца і ў тэксце, і асобна:

)))) – радасць, смех, задавальненне, добры настрой, іронія, жарт;

(((( – сум, смутак, жалоба, спачуванне, незадавальненне, расчараванне;

!!! – папярэджанне, эмацыянальнае ўзмацненне;

???? – пытанне, непаразуменне, здзіўленне;

… – недаказанасць, працяг, незавершанасць.

Важны момант – колькасць эматыконаў у тэксце. Чым іх больш, тым больш эмоцый яны перадаюць. Аднак іх колькасць таксама павінна быць матываванай і вымушанай перлакутыўным эфектам.

Месца размяшчэння эматыкона ўплывае на яго значэнне. Калі эматыкон стаіць перад словам, то хутчэй за ўсё ён не адносіцца да выказвання. Калі пасля слова стаіць кропка, а пасля яе праз прабел – дужкі, то эмоцыя, якую перадае гэты эматыкон, можа быць адасоблена ад сказа і, адпаведна, мець дадатковае значэнне.

Актуальным пытаннем для беларускамоўнага інтэрнэту застаецца спалучэнне смайлаў са знакамі прыпынку, паколькі апошнія ўплываюць на арфаграфію. Ад знакаў прыпынку залежыць, напрыклад, выкарыстанне літары *ў*.

Камунікатыўныя тэндэнцыі апошніх гадоў паказваюць на набыццё менавіта эматыконамі (простымі аднабаковымі дужкамі) функцыі знака прыпынку ў канцы сказа. А вось “напісанне” смайлаў ( *:-)* ) робіцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі спецыялістаў. Так, Арцемій Лебедзеў у кнізе “Каводства” дае наступныя правілы:

1. смайлік адбіваецца ад слова прабелам;
2. калі пасля смайліка ідзе знак прыпынку, ён прабелам не адбіваецца;
3. кропка пасля смайліка звычайна не ставіцца;
4. смайлік можа быць сумешчаны са звычайнай закрывальнай дужкай (пры ўмове, што яна недзе адкрылася :-)).

Прафесар В.І. Іўчанкаў у кнізе “Беларуская арфаграфія: апавяданні і гісторыі” прыходзіць да наступнай высновы: “Функцыя, якую выконвае смайлік, блізкая да функцыі знака прыпынку, таму ўсё часцей у беларускамоўнай інтэрнэт-прасторы можна сустрэць такія запісы *СТАЯЛА :-) У ВАЧАХ УСМЕШКА*”.

Такім чынам, эматыконы сталі абавязковымі элементамі маўленчых зносін карыстальнікаў інтэрнэту. Яны спрашчаюць і паскараюць працэс камунікацыі, што вельмі важна ў сучасным свеце. Без іх сёння немагчыма ўявіць дыялог ці маналог у інтэрнэце.